ISSN 1561-8323 (Print)
ISSN 2524-2431 (Online)

## *СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ*

### *SOCIAL SCIENCES AND HUMANITIES*

УДК 39(=161.3)-027.21:[316.323.72+7.036.1]
https://doi.org/10.29235/1561-8323-2019-63-5-633-640

Поступило в редакцию 08.04.2019
Received 08.04.2019

**Н. А. Гулак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# БЕЛАРУСКАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА Ў КАНТЭКСЦЕ ІДЭЙ І ПРАКТЫКІ САЦРЭАЛІЗМУ

*(Прадстаўлена акадэмікам А. І. Лакотка)*

**Аннотация.** На большом фактическом материале прослежено формирование системы идеологических и социально-культурных установок и регулятивов, которые имплементировали метод социалистического реализма в теорию и практику белорусской фольклористики. Доказано, что в 1930-е годы соцреализм утвердился как идеология науки о народном творчестве, в результате чего она практически потеряла свою автономность и начала существовать в системе новых концептуальных координат диалога с социумом. В широком контексте рассмотрено становление в академическом дискурсе и культурной практике Беларуси масштабного и уникального по своей природе проекта под названием «советский фольклор». Утверждается, что белорусские фольклористы были инкорпорированы в санкционированный и идеологически очерченный властью процесс выявления и репрезентации образцов нового народного социалистического искусства. Стратегии присоединения интеллигенции к соцреалистическому дискурсу в 1930–1950-е годы представляли собой разнообразные формы компромисса между наукой, носителем традиционной культуры, массовым адресатом советской культуры и властью. Определено, что методологический кризис науки эпохи соцреализма выразился в унификации фольклора, формировании канона – корпуса текстов с высокой идеологической модальностью; исключении из исследовательского поля целого пласта неподцензурной фольклорной традиции; игнорировании в собирательской и эдиционной практике диалектной природы традиционной культуры; размывании границ объекта исследования фольклористики в результате легализации в ней активного самодеятельного автора и включения в исследовательскую парадигму фактов любительского творчества и публицистики. Использованы новые факты истории фольклористики, позволяющие избежать односторонних трактовок явлений истории фольклористики советского периода и расширяющие проблемное поле современной науки.

**Ключевые слова:** фольклористика, социалистический реализм, народность, дискурс, самодеятельное творчество, идеологические кампании, собирательская практика

**Для цитирования:** Гулак, Н. А. Беларуская фалькларыстыка ў кантэксце ідэй і практыкі сацрэалізму / Н. А. Гулак // Докл. Нац. акад. наук Беларуси. – 2019. – Т. 63, № 5. – С. 633–640. https://doi.org/10.29235/1561-8323-2019-63-5-633-640

**Nastassia A. Hulak**

*Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Republic of Belarus*

# BELARUS FOLKLORE STUDIES IN THE CONTEXT OF IDEAS AND PRACTICE OF SOCIALIST REALISM

*(Communicated by Academician Alexander I. Lokotko)*

**Abstract.** Based on the great factual material, the article retraces the formation of ideological, social and cultural attitudes and regulations that implemented the socialist realism methodology in theory and practice of the Belarus folklore studies. In the 1930s, the socialist realism established itself as an ideology of the folk art studies, as a result of which it virtually lost its independence and entered the system of new conceptual coordinates in social dialogue. The article broadly examines the establishment of an extensive and inherently unique project known as the “Soviet folklore” in the academic and cultural

© Гулак Н. А., 2019

discourse of Belarus. Belarusian folklorists were claimed to be incorporated in the process of finding and representing the works of the new socialist folklore art authorized and ideologically defined by those in authority. The strategies of adherence of intellectuals to the social realist discourse during the period of 1930–1950 included various forms of compromise between science, traditional culture holders, mass recipients of the Soviet culture and the authorities. The article states that the methodological crisis in social realist science has expressed itself through the unification of folklore and the established canon (i. e. the corpus of texts of explicit ideological modality), the elimination of the whole layer of uncensored folklore texts from the scope of the study; the ignoring of the dialect nature of traditional culture in collection and editing practices; the blurring of the research subject in folklore studies due to the legitimized role of an active amateur artist, as well as amateur art and punlication integrated to the research paradigm. The article employs new facts from the history of folklore studies that prevent the one-way interpretation of the specific features of the Soviet period folklore studies and expand the problem field of the modern science.

**Keywords:** folklore studies, socialist realism, nationality, discourse, amateur art, ideological campaign, collection practice

**For citation:** Hulak N. A. Belarus folklore studies in the context of ideas and practice of socialist realism. *Doklady Natsional'noi akademii nauk Belarusi = Doklady of the National Academy of Sciences of Belarus*, 2019, vol. 63, no. 5, pp. 633–640 (in Belarussian). https://doi.org/10.29235/1561-8323-2019-63-5-633-640

**Уводзіны.** Пабудова аб'ектыўнай гісторыка-тэарэтычнай мадэлі беларускай фалькларыстыкі савецкага перыяду патрабуе распрацоўкі шэрагу навуковых праблем. Сярод іх аналіз «ідэалогіі» навукі савецкага часу – метаду сацыялістычнага рэалізму і стратэгій прыстасавання да гэтай ідэалогіі актараў навуковага дыскурсу (акадэмічных калектываў, асобных даследчыкаў і збіральнікаў, самадзейных выканаўцаў і інш.); канцэптуальнае асэнсаванне ўнікальнага па сваёй прыродзе сацыяльна-культурнага эксперымента, якім з'яўляецца афіцыйна санкцыянаваны савецкі фальклор, і той неафіцыйнай (непадцэнзурнай) фальклорнай традыцыі, якая пакуль застаецца цалкам на перыферыі навуковай рэфлексіі[1]. Заслугоўвае ўвагі вызначэнне на ўсіх узроўнях традыцыі савецкага часу найбольш устойлівых фальклорна-міфалагічных мадэляў, жанравых форм, матываў і іх ролі ў фарміраванні карціны свету. Цікавыя вынікі можа даць разгляд народнай творчасці савецкага перыяду ў ракурсе яе інтэртэкстуальнасці, сацыякультурных функцый і інш.[2].

Усё гэта вымагае новых метадалагічных падыходаў, істотнага пашырэння аб'екта даследавання, а таксама дэканструкцыі вялікага кола крыніц (крытыкі, зборнікаў вусна-паэтычнай творчасці), створаных у перыяд манаполіі сацрэалізму ў гуманітарнай навуцы. Атрыманню новых ведаў тут будзе садзейнічаць актуалізацыя раней не ўведзеных у навуковы зварот матэрыялаў па гісторыі фалькларыстыкі савецкага перыяду: рукапісаў, цэнзарскіх і рэдактарскіх правак, матэрыялаў праверак і службовых допісаў у сістэме кантралюючых органаў, справаздач навуковых устаноў, газетных артыкулаў, лістоў грамадзян і інш.

**Асноўная частка.** У 1930-я гады ў савецкай краіне сфарміравалася сістэма ідэалагічных і сацыяльна-культурных установак і рэгулятываў, якія імплементавалі новую савецкую ідэалогію ў акадэмічную навуку. Развіццё акадэмічнай сферы праходзіла ў рэчышчы новых ідэалагічных каардынат. Паралельна адбываўся працэс станаўлення разгалінаванай цэнтралізаванай структуры партыйна-дзяржаўнага кантролю і цэнзуры, элементы якой – КПСС, КДБ і Галоўліт – ажыццяўлялі кіраванне культурай, навукай, выдавецкай дзейнасцю[3].

Савецкія фалькларысты заснаванай у 1931 г. у сістэме АН СССР[4] фальклорнай секцыі афіцыйна дэкларавалі неабходнасць рэвізіі і крытычнага пераасэнсавання дакастрычніцкіх і буржуазных метадалогій, стварэння тэорыі фалькларыстыкі на аснове марксізму-ленінізму і ў цеснай сувязі з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Задачы акадэмічнай фальклорнай секцыі былі абумоўлены месцам фальклору ў шэрагу гістарычных крыніц і вызначэннем фалькларыстыкі,

---

[1] Канкрэтыцы рэчаіснасці савецкай Беларусі і трактоўцы савецкай прыпеўкі прысвечаны асобныя артыкулы А. Гужалоўскага, І. Раманавай, Р. Кавалёвай.

[2] Напр., дыскусійным з'яўляецца апрыёрна прынятае сярод беларускіх даследчыкаў сцверджанне, што неафіцыйны фальклор выражае стратэгію супраціву. Але ў ім у дастатковай ступені тэкстуалізаваны таксама і стратэгіі адаптацыі, прыстасавання народнага аўтара да новых сацыяльна-палітычных умоў.

[3] Гл.: Смілавіцкі Л. Л. «Цензура в БССР: послевоенные годы, 1944–1956» (2015); Гужалоўскі А. А. «Чырвоны аловак» (у 2 кн.) (2018).

[4] Ад заснавання фальклорная секцыя была ў складзе Інстытута па вывучэнні народаў СССР, а з 1933 г. увайшла ў Інстытут антрапалогіі, археалогіі і этнаграфіі АН СССР (Ленінград).

паводле М. Я. Мара[1], як гістарычнай дысцыпліны, што вывучае «вусную літаратуру». Рыторыка справаздачнага артыкула ў часопісе «Вестник академии наук СССР» (1935) служыць прыкладам маніфестацыі лаяльнасці савецкіх вучоных да ўлады, праявай своеасаблівай рытуалізацыі працэсу дыялогу навукі і соцыуму.

Адным з галоўных адэптаў савецкага фальклору і ініцыятарам шматлікіх пачынанняў па яго канструяванні быў савецкі даследчык Ю. Сакалоў (1889–1941). У сваіх дакладах і публічных выступленнях ён натхнёна даводзіў і прапагандаваў актыўнае ўмяшальніцтва ў фальклорны працэс, пошукі новых з'яў і падтрымку «парасткаў здаровай пралетарскай і калгаснай вуснай паэзіі». Ю. Сакалоў[2] разам з М. Азадоўскім[3] і Г. Астахавай пазней стане вядучым фалькларыстам сталінскай эпохі. Разам з тым нельга ігнараваць той факт, што ў 1930-я гады падчас разгорнутай з энтузіязмам збіральніцкай работы было зафіксавана шмат надзвычай каштоўнага матэрыялу і распрацаваны цэлыя напрамкі палявых даследаванняў. Як прыклад можна адзначыць уклад Я. Гіпіуса і З. Эвальд, якія працавалі ў фальклорнай секцыі пад кіраўніцтвам М. Азадоўскага, у беларускую этнамузыкалогію. У пачатку 1930-х гадоў яны актыўна супрацоўнічалі з сектарам этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР[4].

У 1932 і 1934 гг. наладжваліся комплексныя экспедыцыі ў Беларусь, у якіх акрамя Я. Гіпіуса і З. Эвальд працаваў малады беларускі этнограф М. Грынблат. Зафіксаваныя ў экспедыцыях тэксты і напевы склалі ў 1940 г. унікальны зборнік беларускай песні, у якім пераважная большасць запісаў на фанограф і на слых надрукаваны ўпершыню[5]. У дадзеным зборніку савецкім песням, тэксты якіх ужо набылі абрысы кананізацыі («Агні бальшэвіцкіх ідэй», «Сталін, родны бацька наш», «Мы стаханаўцамі выйдам» і пад.), прысвечаны адзін з васьмі раздзелаў. Як вынікае з каментарыяў, акрамя М. Грынблата, запісаў якога найбольш, савецкія песні фіксавалі таксама З. Эвальд, Ф. Рубцоў, Н. Сакалоўскі, М. Равенскі, І. Сербаў. Сёння цяжка ацаніць ступень аўтаномнасці збіральнікаў і фактар вымушанай заангажаванасці тых, чые запісы ўвайшлі ў гэты і іншыя зборнікі. Ёсць звесткі пра цэнзурныя забароны ўжо падрыхтаваных выданняў і засакрэчванне матэрыялаў фальклорна-этнаграфічных экспедыцый Інстытута гісторыіі БССР. Аднак нельга пагадзіцца з ацэнкай асобных даследчыкаў, якія персаніфікуюць маштабныя крызісныя з'явы ў беларускай навуцы канца 1930-х гадоў, абвінавачваючы пэўных асоб[6].

Даніну савецкім наватворам у фальклоры, а дакладней – пошукам у ім «новых з'яў», аддавалі многія, хто працаваў у гэты час. У фондах БДАМЛіМ захоўваецца ўкладзены ў 1945 г. Р. Шырмай і прадстаўлены ім у выдавецтва рукапіс зборніка савецкіх песень, загадак, прыпевак і актуальных тады сказаў, зафіксаваных пераважна ў канцы 1930-х гадоў[7]. Тут і песні з рэпертуару народных хароў, і творы самадзейных аўтараў (гарманіста, казачніка, «апавядальніка»), і перадрукоўкі з іншых выданняў. Каментарыі, якія падчас друку не былі ўключаны, паказваюць, што па савецкай песнятворчасці ёсць палявыя матэрыялы Р. Шырмы і М. Грынблата, а таксама М. Калачынскага, А. Цвірко, Н. Сакалоўскага, Э. Галубка, А. Слабадзецкага, А. Пялевіча, А. Пабядзінскага, М. Меяровіч (экспедыцыя ў Пінскую вобласць са студэнтамі Мінскага педінстытута)

---

[1] У 1920–1950-я гады вучэнне М. Я. Мара («марызм») аб класавай прыродзе мовы карысталася дзяржаўнай падтрымкай у СССР.

[2] З 1939 г. Ю. Сакалоў – акадэмік АН УССР, дырэктар Інстытута фальклору АН УССР.

[3] У 1948–1949 гг., падчас кампаніі барацьбы з касмапалітызмам, М. Азадоўскі быў звольнены з Ленінградскага ўніверсітэта і Інстытута рускай літаратуры, дзе кіраваў фальклорнымі аддзяленнямі. У далейшым адышоў ад фалькларыстыкі як сферы навуковых інтарэсаў.

[4] Асновы збірання фальклору ў Беларусі савецкага часу былі закладзены ў 1922–1928 гг. у сістэме Інбелкульта Цэнтральным бюро краязнаўства і звязаны з выдатным беларускім этнографам і фалькларыстам А. А. Шлюбскім.

[5] Песні беларускага народа. Т. 1 (1940). Частка матэрыялаў з гэтага выдання ўвайшла ў зборнік «Белорусские народные песни» (1941) музычна-фальклорнай серыі «Песни народов СССР» пад рэдакцыяй Я. У. Гіпіуса.

[6] Маецца на ўвазе рэзка крытычная ацэнка дзейнасці М. Грынблата, дадзеная А. Фядосікам у кнізе «Ілюзорнасць і сапраўднасць: "Белыя плямы" ў гісторыі фалькларыстыкі 20–30-х гадоў» (1991). Альтэрнатыўная пазіцыя прадстаўлена ў артыкуле С. Захаркевіча «Як гартавалася сталь: Станаўленне беларускага савецкага этнолага Маісея Якаўлевіча Грынблата» (2016).

[7] Надрукавана ў 1947 г.: «Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі» (уклад. Р. Шырма, рэд. М. Клімковіч). У зборнік увайшло ўсяго чатыры творы савецкай тэматыкі з усіх, сабраных Р. Шырмай. Яны змешчаны ў рубрыцы «17 верасня 1939 года». Біяграфічныя звесткі гэтага перыяду сведчаць, што Р. Шырма імкнуўся выразіць сваю лаяльнасць да савецкай улады.

[1, спр. 20, л. 465–478]. Прымяняць свой навуковы і практычны вопыт у новых сацыяльна-культурных умовах, паводле А. Фядосіка, імкнуліся таксама дарэвалюцыйныя этнографы і фалькларысты Я. Карскі, А. Сержпутоўскі, І. Сербаў. Але шматлікія сацыяльныя фактары, сярод якіх рэпрэсіі 1930 г. па справе «Саюза вызвалення Беларусі», ужо запусцілі працэс «вульгарызацыі і сацыялагізацыі дзейнасці па вывучэнні народнай творчасці» [2, с. 141], які выразіўся ў разнастайных формах кампрамісу паміж аўтарам і цэнзарам, даследчыкам народнай традыцыі і масавым адрасатам савецкай культуры, уладай і навуковай інтэлігенцыяй.

Даказана, што ўлада, якая канструявала новую савецкую ідэнтычнасць, была зацікаўлена ва ўстаноўцы на фальклор, а для пабудовы гэтай ідэнтычнасці ідэалагема «народнасць» была выключна прадуктыўнай. Народнае мастацтва з яго анталагічнымі характарыстыкамі (калектыўнасць, традыцыйнасць і варыятыўнасць), з тоеснасцю аўтара і рэцыпіента магло эфектыўна выконваць задачу стварэння, рэпрэзентацыі і сацыяльнай легітымізацыі савецкай ідэалогіі, атрымання народнай падтрымкі.

Актыўная арганізацыйная праца ў гэтым кірунку пачалася з 1933 г. ва Усесаюзным доме народнай творчасці і Саюзе савецкіх пісьменнікаў (з 1934 г.). Па ініцыятыве М. Горкага ў пісьменніцкай арганізацыі была створана фальклорная секцыя. У саюз прымалі выканаўцаў з народа, асобныя з іх ганараваліся званнем «народнага паэта», іх творы шырока прапагандаваліся і выходзілі асобнымі выданнямі [3, с. 10]. Кніжныя выдавецтвы[1] распачалі выпуск фальклорных серый. Імператыў запісваць савецкі фальклор знайшоў водгук у масавым друку[2]. Напярэдадні з’езду пісьменнікаў і ў працяг яго рашэнняў цэнтральныя газеты, мастацка-літаратурныя выданні і альманахі[3] публікавалі лісты з месцаў і «фалькларыстычныя артыкулы», якія ў большасці сваёй з’яўляліся нескладанымі публіцыстычнымі нарысамі ці замалёўкамі.

У 1936 г. пры Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР, нягледзячы на існаванне ў сістэме Інстытута гісторыі структурнага падраздзялення, была сфарміравана спецыяльная фальклорная камісія, склад якой указвае на яе ганаровы статус і прадстаўнічыя функцыі: старшыня – Я. Колас, сярод сяброў – акадэмікі В. Шчарбакоў, М. Нікольскі, народны паэт Я. Купала, М. Лынькоў, А. Александровіч, І. Харык, М. Клімковіч і інш. [2, с. 145]. У гэтым жа годзе камісія арганізавала конкурс на лепшага збіральніка з мэтай «узмацнення запісу» савецкага фальклору БССР і прыцягнення найбольшай колькасці карэспандэнтаў. У архіў АН БССР паступілі дзясяткі тысяч адзінак тэкстаў, супрацоўнікі сектара этнаграфіі і фальклору рыхтавалі для газет «Звязда», «Літаратура і мастацтва» тэматычныя падборкі (пра Канстытуцыю СССР[4], Чырвоную армію і пад.). У фальклорных зборніках 1937–1940 гг.[5] беларускі савецкі фальклор выступае як элемент новай сацыялістычнай культуры.

Такім чынам, у сярэдзіне 1930-х гадоў афарміўся своеасаблівы сацыяльна-культурны рух, у аснове якога ляжыць творчая ініцыятыва мас па стварэнні і выяўленні ўзораў новага народнага сацыялістычнага мастацтва. Гэты рух санкцыянаваны і ідэалагічна акрэслены ўладай з мэтай фарміравання савецкай ідэнтычнасці. Ён ахоплівае розныя слаі насельніцтва, шырыцца, набывае масавы характар. Фалькларысты, якія непасрэдна працуюць з народнай культурай, аб’яднаны гэтым рухам. Яго ідэалагічны падмурак умацоўваецца пастуліраваннем у савецкае мастацтва метаду сацыялістычнага рэалізму, «увядзеннем фальклору ў сацрэалістычны канон» [4, с. 70] на Першым Усесаюзным з’ездзе савецкіх пісьменнікаў (1934). Важна спыніцца на горкаўскай трактоўцы народнай творчасці, бо першы старшыня Саюза пісьменнікаў СССР у 1934 г.

---

[1] Выдавецтвы «Библиотека поэта», Academia, «Гослитиздат».

[2] У 1934 г. рэдакцыя газеты «Пионерская правда» за некалькі месяцаў сабрала і часткова надрукавала больш за 500 народных казак, запісаных піянерамі і школьнікамі савецкай краіны, якія былі дасланы галоўнаму пралетарскаму пісьменніку. Хвалі ўсесаюзных кампаній па зборы савецкага фальклору суправаджалі падрыхтоўку пафасных саюзных выданняў з удзелам М. Горкага «Две пятилетки» (1937), «Творчество народов СССР» (1937).

[3] «Правда», «Известия», «Комсомольская правда», «Литературная газета», «Новый мир», «Красная новь», «Октябрь», «Север» і інш.

[4] Канстытуцыя СССР 1936 г. (неафіцыйная назва – «Сталінская канстытуцыя»). Дзейнічала да 1977 г.

[5] «Ленін і Сталін у беларускай народнай творчасці» (1937), «Чырвоная армія і абарона Радзімы ў беларускай народнай творчасці» (1938), «Дарэвалюцыйная і Савецкая Беларусь у народнай творчасці» (1938), «Беларускі народ супроць папоў і рэлігіі» і «Жанчына ў беларускай народнай творчасці» (1940).

у сваім дакладзе агучыў сацыяльны заказ да даследчыкаў народнай творчасці, на дзесяцігоддзі звязаўшы іх павестку з літаратуразнаўствам[1].

Разуменне М. Горкім фальклору грунтавалася ў першую чаргу на яго асабістым жыццёвым вопыце і не мела сістэмнага характару[2]. Прывядзем самы разгорнуты «фалькларыстычны тэзіс» пралетарскага пісьменніка з даклада на з'ездзе: «Найбольш глыбокія і яркія, дасканалыя ў мастацкіх адносінах тыпы герояў створаны фальклорам, вуснай творчасцю працоўнага народа. Дасканаласць такіх вобразаў, як Геркулес, Праметэй, Мікула Селянінавіч, Святагор, далей, доктар Фаўст, Васіліса Прымудрая і, нарэшце, – Пятрушка, які адольвае доктара, папа, паліцэйскага, чорта і нават смерць, – усё гэта вобразы, у стварэнні якіх гарманічна спалучыліся рацыо і інтуіцыю, думка і пачуццё. <…> Герой фальклору – "дурань", якім пагарджаюць нават бацька і браты, заўсёды выходзіць разумнейшым за іх, заўсёды пераможца ўсіх жыццёвых нягод, таксама перадольвае іх і Васіліса Прыўкрасная» [5, с. 8]. У сваёй інтэрпрэтацыі фальклору як натуральнага ідэалу літаратуры эпохі сацыялізму М. Горкі надаў яму значэнне дакументальнага сведчання савецкай рэальнасці. Паводле У. Юстус, у выніку розных рытарычных і дыскурсіўных дыферэнцыяцый народная творчасць была выведзена як з кантэксту архаіка-сялянскай культуры, так і з кантэксту феадальна-арыстакратычнай культуры, дзе эпас і быліны разглядаліся як перажыткі культуры дваранскай [4, с. 70]. Паўстала ідэалагічна абгрунтаваная задача канструявання новага тыпу народнай творчасці (дакументальнага сведчання савецкай рэальнасці) на базе і з улікам старых традыцый, а таксама, што важна, пад кіраўніцтвам і пры актыўным умяшальніцтве творчай інтэлігенцыі.

Развіваць фалькларыстыку ў сацрэалістычным дыскурсе было, як паказаў час, складанай задачай. Тэорыя сацрэалізму, асабліва ў яе сталінска-ждանаўскі перыяд, была, паводле Т. Кругловай, не тэорыяй у дакладным сэнсе слова, а, хутчэй, маніфестацыяй прынцыпаў і апалогіяй эталонных твораў. «Сацрэалізм выступаў у гэты перыяд як у якасці ўладнай сілы, якая арганізуе поле мастацкай вытворчасці і спажывання, вызначае правілы гульні ўсіх агентаў, так і ў якасці саміх твораў, якія носяць эталонны характар для ўсёй мастацкай сістэмы» [6, с. 4–5]. У адрозненне ад савецкага мастака, які мог кантраляваць свой уласны мастацкі прадукт на адпаведнасць сацыяльнай замове, фалькларыст вымушаны быў асэнсоўваць тыя з'явы, якія ўжо існуюць. Таму пры выяўленні і інтэрпрэтацыі твораў з высокай ідэалагічнай мадальнасцю, а таксама ў эдыцыйнай практыцы ён непазбежна станавіўся на шлях замоўчвання, падмены значэнняў, канструявання ці легалізацыі графаманскіх «фактаў сучаснай наватворчасці». Радыкальным сродкам, які таксама практыкаваўся, было ўздзеянне на выканаўцаў і маніпуляцыя іх тэкстамі ў мэтах палітычнай кан'юнктуры. Напрыклад, у РСФСР у канцы 1937 г. большасць выканаўцаў традыцыйнага фальклору былі прыцягнуты да распаўсюджвання партыйнай прапаганды ў масах [3, с. 17]. Падобная практыка назіралася і ў беларускай навуцы, што з'яўляецца тэмай асобнага даследавання. Паступова гэта прывяло да ўкаранення шырокай, надзвычай расплывістай трактоўкі народнай творчасці («народная сацыялістычная культура»), размывання межаў аб'екта даследавання фалькларыстыкі і легалізацыі ў ёй актыўнага самадзейнага аўтара.

У канцы 1930-х гадоў аматарская творчасць і мастацкая самадзейнасць у савецкай краіне пад кіраўніцтвам сістэмы дзяржаўных устаноў пашыраюцца. У лютым 1937 г. у БССР быў створаны Рэспубліканскі дом народнай творчасці (РДНТ). Да 1941 г. працавала ўжо пяць абласных ДНТ ва ўсходніх раёнах БССР, адзін – у Беластоку і чатыры – у заходніх абласцях. Да 1939 г. РДНТ правёў у Мінску дзве рэспубліканскія алімпіяды мастацкай самадзейнасці і дзве рэспубліканскія выставы народнай творчасці.

У час Вялікай Айчыннай вайны творчая актыўнасць мас ва ўсіх яе эстэтычных формах набыла ідэйную перакадзіроўку і, пры ўсёй неаднароднасці яе стылістыкі, выразнае ідэйна-мастацкае адзінства. Запісы песень ваенных гадоў, якія пачалі рабіць з 1942 г., першыя зборнікі парты-

[1] Ролі М. Горкага як ідэйнага натхняльніка «савецкага фальклору» прысвечаны даследаванні У. Юстус, Ф. Мілера і інш.

[2] З «фалькларыстычнай спадчыны» М. Горкага часта цытуецца яго заклік збіраць фальклор, які прагучаў на з'ездзе ў 1934 г. Адна з першых спроб абагульнення асобных тэзісаў пралетарскага пісьменніка па гэтай тэме зроблена савецкім літаратуразнаўцам М. К. Піксанавым у кнізе «Горький и фольклор» (1938).

занскіх песень, падпольнага друку Беларусі паказалі ўнікальнасць такой з'явы, як народная творчасць ваеннага часу. На адным полюсе гэтага своеасаблівага культурнага кода знаходзіліся ўзоры савецкіх кампазітараў-песеннікаў і іх шматлікія пералажэнні, а на другім – дарэвалюцыйная салдацкая і сацыяльна-бытавая песня, познетрадыцыйная балада, жорсткі раманс і інш. Такі ўнікальны па сваёй сацыяльна-гістарычнай прыродзе кангламерат эфектыўна выконваў не толькі мастацкія, але і пазамастацкія функцыі (ідэйная зброя ў змаганні з ворагам). Збіранне ўзораў народнай творчасці ваеннага часу ўспрымаецца грамадскасцю савецкай краіны як патрыятычны абавязак.

У пасляваенныя гады ставілася задача асэнсавання гэтага калектыўнага мастацкага вопыту, але акадэмічная навука БССР ні метадалагічна, ні арганізацыйна (яе інстытуты і фонды былі разбураны падчас вайны) не магла ахапіць гэты працэс. У 1947 г. Упраўленне прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б праверыла выкананне плана навукова-даследчай і выдавецкай дзейнасці Акадэміі навук Беларускай ССР на 1946–1947 гг. У дакладной запісцы пазначалася, што завяршэнне многіх важнейшых тэм, сярод якіх «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне», увесь час пераносілася, тэма партызанскага руху не атрымала належнага асвятлення, а на першы выпуск «Гісторыі БССР» (1946) была дадзена адмоўная ацэнка ЦК КП(б)Б і грамадскасці. У выніку сектар этнаграфіі трэці год не можа скончыць сваю асноўную тэму, прадугледжаную выдавецтвам [7, л. 119–120]. У планах Інстытута гісторыі інтарэсы сектара М. Грынблата прадстаўлены недастаткова. Сярод 11 навуковых тэм, якія працягваюцца ў 1949 г., стаіць «Фінікійская жніўная міфалогія і абраднасць», «Афінская дэмакратыя як форма дыктатуры рабаўладальнікаў» і толькі адна ўласна фальклорна-этнаграфічная тэма, сфармуляваная як «Этнаграфія беларусаў і беларускі фальклор» [1, спр. 24, л. 319–320].

Звесткі пра экспедыцыйную работу фалькларыстаў і этнографаў Беларусі ў пасляваенны перыяд разрозненыя. Напрыклад, значны палявы матэрыял па вайне сабраны падчас экспедыцый 1945–1949, 1957, 1958, 1960 і 1962 гг. у розныя раёны Беларусі пад кіраўніцтвам і з удзелам М. Грынблата, Г. Цітовіча, Л. Барага, М. Меяровіч, Л. Мухарынскай, Г. Барташэвіч. Аднак нягледзячы на ідэалагічныя ўстаноўкі пра важнасць народнай творчасці ваеннага часу, многія з гэтых тэкстаў практычна не даходзяць да публікацыі. Прычынай служыць немагчымасць пераадольваць цэнзурныя бар'еры і рэальная пагроза ў выпадку, калі публікацыя ці яе аўтар будуць расцэненыя як ідэалагічна чужыя. Да нашага часу ў беларускіх архівах застаюцца тэксты, якія ўяўляюць некананічны фальклор вайны: разнастайныя формы і перапрацоўкі гарадскога раманса, песні інвалідаў, псалмы і вершы пратэстантаў, сюжэты-кур'ёзы, якія адлюстроўваюць наіўна народнае асэнсаванне савецкіх міфалагем, і іншае.

У той жа час практыка паказвае, што масава збіраць фальклор без спецыяльнай падрыхтоўкі, як у свой час заклікаў М. Горкі, складана[1], нават пры выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу. Напрыклад, у справаздачы Бабруйскага ДНТ за 1946 г. паведамляецца, што па пытанні збору фальклору супрацоўнікі ўстановы рассылалі метадычныя лісты і інструкцыі, выязджалі ў раёны Краснай Слабады, Капыля, Любані і Слуцка, давалі заданне культасветработнікам і настаўнікам. Аднак гэта мерапрыемства, па-сутнасці, было сарвана, галоўным чынам з-за адсутнасці спецыялістаў. Метадыст т. Сумейка, гаворыцца ў справаздачы, запісаў у Слуцкім раёне пяць песень, але прааналізаваць гэты матэрыял Бабруйскі ДНТ не можа [1, спр. 24, л. 38]. Праз год сітуацыя ў Бабруйскім абласным ДНТ не змянілася: «Гэта праца ідзе нездавальняюча з-за адсутнасці спецыяльнага работніка. Намі быў запрошаны на гэту працу работнік Аблкультасветаддзела тав. Шапіра Ошэр Ідэлевіч – 1919 года нар., яўрэй, член УЛКСМ. З дапамогай гэтага работніка за справаздачны перыяд было сабрана прыпевак – 8, вершаваных сказаў – 6, песень без нот – 1, прыказак – 5 і адзін гумарыстычны аповяд пра Бабруйскі кацёл»[2] [1, спр. 24, л. 107].

Органы кіравання самадзейнай народнай творчасцю праводзілі своеасаблівыя «мабілізацыйныя мерапрыемствы» – Усесаюзныя конкурсы стваральнікаў і збіральнікаў фальклору. Першы такі конкурс адбыўся ўвосень 1945 г., ужо ў сакавіку 1946 г. абвяшчаецца другі. Конкурсныя творы потым служылі славесным і музычным матэрыялам для савецкай эстрады і самадзейна-

[1] Пра гэта пісаў яшчэ А. А. Шлюбскі ў артыкулах 1927 і 1928 гг. (часопіс «Наш край»).

[2] Частка буйнамаштабнай наступальнай ваеннай аперацыі Узброеных сіл СССР 24 чэрвеня – 29 чэрвеня 1944 г.

сці. Для шырокага распаўсюду патрабаваліся таксама песеннікі савецкіх песень. З улікам таго, што яшчэ даваенныя фальклорныя экспедыцыі паказалі – у вёску масавая савецкая песня пранікла недастаткова.

Ідэалагічныя кампаніі 1945–1953 гг. пад кіраўніцтвам А. Жданава і адпаведныя пастановы[1] істотна паўплывалі на сферу культуры і грамадскага жыцця савецкай краіны, а акадэмічная навука яшчэ больш пазбавілася аўтаноміі. Пасля выхаду ў 1946 г. Пастановы ЦК ВКП(б) па літаратуры разгарнулася барацьба з безыдэйнымі ці ідэалагічна шкоднымі публікацыямі, узмацніўся партыйны кантроль за творчай інтэлігенцыяй. Гэта вызначала, у тым ліку, вектар навуковых даследаванняў у фалькларыстыцы.

У снежні 1947 г. у Інстытуце этнаграфіі АН СССР склікаецца спецыяльная Усесаюзная нарада па цэнтральнай праблеме тагачаснай фалькларыстыкі – збіранні, вывучэнні і публікацыі народнай творчасці часоў вайны[2]. У выступленнях даследчыц В. Крупянскай і С. Мінц закраналіся праблемы метадалогіі. Паводле В. Крупянскай, збіральніцкая практыка ваеннага і пасляваеннага часу паказала, што навука не валодае інструментарыем для асэнсавання фальклору вайны ў поўным аб'ёме [8, с. 211]. Аднак тэндэнцыя да кананізацыі фальклору вайны ўжо атрымала абрысы ў навуковым асяроддзі. Дакладчыкі выступалі за адлюстраванне новай героікі, паказ гераічных жанраў і «новага гучання старых тэкстаў», указвалі на неабходнасць строгага крытычнага адбору матэрыялу пры публікацыі.

У 1953 г. па выніках праверкі Інстытута гісторыі АН БССР, у структуру якога ўваходзіў сектар этнаграфіі і фальклору, было дакладзена: «Варта адзначыць, што ў Рэспубліцы ніхто спецыяльна не займаецца фальклорам: ні Інстытут гісторыі, ні Інстытут літаратуры і мовы» [9, л. 249–250]. Грамадскае развіццё патрабавала ўдасканалення структурнай арганізацыі навуковых устаноў і іх кадравага ўмацавання. Як вынік у 1957 г. ствараецца акадэмічны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. З 1960-х гадоў навуковая думка паступова пайшла па шляху пераадолення ідэалагічных установак сацрэалізму, абнаўлення метадалогіі і пошуку новых каштоўнасных арыенціраў.

**Заключэнне.** У 1930-я гады ў тэорыі і збіральніцкай практыцы беларускай фалькларыстыкі сцвярджаецца метад сацыялістычнага рэалізму. Гэта абумоўлена неабходнасцю канструявання і легітымізацыі новай савецкай ідэнтычнасці, у кантэксце чаго ўстаноўка на народную творчасць была выключна прадуктыўнай. Фальклор, прырода якога характарызуецца тоеснасцю аўтара і рэцыпіента, варыятыўнасцю і вуснасцю бытавання, на думку ідэолагаў сацрэалізму на чале з М. Горкім, мог эфектыўна выконваць задачу рэпрэзентацыі сацыяльных пераўтварэнняў і прагрэсу сацыялістычнага грамадства. Першы з'езд савецкіх пісьменнікаў вызначыў вектар навуковых даследаванняў у фалькларыстыцы, паставіўшы перад навуковай грамадскасцю ідэалагічна абгрунтаваную задачу пошуку ўзораў народнай творчасці новага тыпу. Актыўная арганізацыйная праца ў гэтым кірунку пачынаецца з 1933 г., цэнтрамі яе служаць не акадэмічныя ўстановы, а Саюз савецкіх пісьменнікаў і савецкія ўстановы кіравання самадзейнай народнай творчасцю.

З улікам фактару вымушанай заангажаванасці і суб'ектыўна абумоўленай інтэнцыі да пошуку новых з'яў народнай культуры, можна сцвярджаць, што многія фалькларысты і дзеячы культуры Беларусі імкнуліся прымяняць свой навуковы і практычны вопыт у новых сацыяльна-культурных умовах. Збіральніцкая праца, разгорнутая з энтузіязмам у савецкай краіне, падтрымлівалася сістэмай партыйна-дзяржаўнага кантролю і цэнзуры. Уключэнне ў даследчую парадыгму фалькларыстыкі фактаў аматарскай творчасці, мастацкай самадзейнасці і публіцыстыкі прывяло да размывання межаў аб'екта даследавання, тэндэнцыйнасці і ўмоўнасці навуковага каментарыя і ўніфікацыі тэкстаў, якія публікаваліся ў зборніках.

У выніку ідэалагічных кампаній 1945–1953 гг. акадэмічная навука яшчэ больш пазбавілася аўтаноміі, дзякуючы чаму і народная творчасць часоў Вялікай Айчыннай вайны, і іншыя з'явы народнай традыцыі засталіся слаба канцэптуалізаванымі.

[1] Пастановы «О журналах "Звезда" и "Ленинград"» ад 14 жніўня 1946 г. і «Об опере "Великая дружба" В. Мурадели» ад 10 лютага 1948 г. асэнсаваны ў навуцы як дакументы, якія характарызуюць палітыку савецкай улады ў адносінах да творчай інтэлігенцыі.

[2] Беларускую дэлегацыю прадстаўлялі І. Гутараў, Л. Бараг, М. Грынблат, Г. Цітовіч. Неафіцыйна прызнавалася, што ў БССР партызанскі фальклор з'яўляецца прыярытэтным і найбольш грунтоўна даследаваным.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 79. – Воп. 1.

2. Гужалоўскі, А. А. Пачатак канструявання сталінскага фальклору ў БССР (1934–1935 гг.) / А. А. Гужалоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – Мінск, 2018. – Вып. 25. – С. 141–146.

3. Миллер, Ф. Сталинский фольклор: пер. с англ. / Фрэнк Миллер. – СПб., 2006. – 188 с.

4. Юстус, У. Возвращение в рай: соцреализм и фольклор / У. Юстус // Соцреалистический канон. – СПб., 2000. – С. 70–86.

5. Первый Всесоюзный съезд советских писателей 1934: стенограф. отчет. – М., 1934. – 718 с.

6. Круглова, Т. А. Искусство соцреализма как культурно-антропологическая и художественно-коммуникативная система: исторические основания, специфика дискурса и социокультурная роль. – Екатеринбург, 2005. – 46 с.

7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. – Воп. 47. – Спр. 148.

8. Гершкович, Б. Совещание по вопросам собирания, изучения и издания фольклора Великой Отечественной войны / Б. Гершкович, В. Крупянская, В. Соколова // Советская этнография. – 1948. – № 2. – С. 209–216.

9. НАРБ. – Ф. 4п. – Воп. 73. – Спр. 72.

## References

1. *Belarusian State Archive-Museum of Literature and Art*. Fund 79, inventory 1.

2. Guzhalouski A. Beginning the Construction of the Stalin's folklore in BSSR (1934–1935). *Pytanni mastatstvaznaustva, ehtnalogii i falklarystyki* [*Issues of art, ethnology and folklore*]. Minsk, 2018, vol. 25, pp. 141–146 (in Belarusian).

3. Miller F. *Stalin's folklore*. Saint Petersburg, 2006. 188 p. (in Russian).

4. Yustus U. Return to Paradise: Socialist Realism and Folklore. *Sotsrealisticheskij kanon* [*Canon of Socialist Realism*]. Saint Petersburg, 2000, pp. 70–86 (in Russian).

5. *First All-Union Congress of Soviet Writers in 1934: verbatim report*. Moscow, 1934. 718 p. (in Russian).

6. Kruglova T. *Socialist Realism Art as a Cultural Anthropological and Artistic Communication System: Historical Grounds, Discourse Specifics and Sociocultural Function*. Ekaterinburg, 2005. 46 p. (in Russian).

7. *National Archives of the Republic of Belarus (NARB)*. Fund 4п, inventory 47, case 148.

8. Gershkovich B., Krupyanskaya V., Sokolova V. Meeting on the collection, study and publication of the World War II folklore. *Sovetskaya etnografiya* [*Soviet Ethnography*], 1948, no. 2, pp. 209–216 (in Russian).

9. *NARB*. Fund 4п, inventory 73, case 72.

## Информация об авторе

*Гулак Анастасия Анатольевна* – канд. филолог. наук. Белорусский государственный университет культуры и искусств (ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: rudolfina.hulak@tut.by.

## Information about the author

*Hulak Nastassia Anatoljeuna* – Ph. D. (Philology). Belarusian State University of Culture and Arts (17, Rabkorovskaya Str., 220007, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: rudolfina.hulak@tut.by.